# РОЛЯ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ ЎНАРМАВАНАГА МАЎЛЕННЯ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

**Ю. У. Лескавец, Я. В. Ясінская**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік М. У. Буракова, канд. філал. навук, дац.

Самай актыўнай часткай грамадства з'яўляецца сучасная моладзь. Менавіта яна хутка рэагуе на ўсе відазмяненні ў соцыуме, у тым ліку і моўныя. Моладзь з'яўляецца ініцыятарам моўных змен і можа непасрэдна ўздзейнічаць на развіццё мовы. Асобай увагі заслугоўваюць адметнасці маўленчых паводзін сучасных студэнтаў, а таксама што выступае ў якасці асноўнай крыніцы фарміравання каштоўнасцей сучаснай моладзі.

Аб'ектам нашага даследавання стала маўленне і матэрыял анкетавання студэнтаў 1 курса тэхнічных спецыяльнасцей ГДТУ ім. П. В. Сухога. Мэта работы – аналіз спецыфічных для сучаснай моладзі адметнасцей пры выбары і наборы моўных адзінак, а таксама выяўленне ролі сродкаў масавай інфармацыі (СМІ) ў працэсе фарміравання маўлення сучаснай моладзі.

Мова з'яўляецца асноўным сродкам камунікацыі і адлюстраваннем нацыянальнай культуры. Мы бачым вялікую ролю ўмацавання пазіцый літаратурнай мовы ў сучаснай моладзі, так як менавіта ў такім узросце складваюцца маральныя прынцыпы, канчаткова фарміруюцца светапогляд і разнастайныя стэрэатыпы. Вельмі важна своечасова накіраваць гэта развіццё ў правільным накірунку і выхаваць у моладзі маральна-этычныя нормы. Асобае месца сярод моладзі займае студэнцтва, прадстаўнікі якога з'яўляюцца будучымі спецыялістамі, прадстаўнікамі інтэлігенцыі, якая будзе аказваць уплыў на фарміраванне і захаванне мовы ў будучым.

Адной з асноўных праблем сучаснага грамадства з'яўляецца забруджванне мовы. Ненарматыўная лексіка ўсё больш і больш распаўсюджваецца ў маўленні нашых грамадзян, асабліва моладзі. Гэта праблема набывае маштабы агульнанацыянальнага культурнага бедства. І аб гэтым нельга маўчаць, трэба прымаць меры па ліквідацыі данай праблемы.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы маюць магчымасці для фарміравання ў сучаснай моладзі маральна-этычных норм. Даныя магчымасці могуць быць рэалізаваны як у вучэбным працэсе, так і пазавучэбнай дзейнасці, так як «адукацыя як сацыяльны інстытут з'яўляецца неад'емнай часткай грамадства і механізмам трансляцыі культуры, а яго якасць – асновай культуры» [1, с. 7]. Менавіта ў студэнцкім грамадстве, у межах роднага вну могуць быць сфарміраваны правільныя адносіны да літаратурнай мовы. Аднак абавязковы мінімум сучаснай беларускай адукацыйнай праграмы для тэхнічных спецыяльнасцей уключае толькі адну дысцыпліну, якая садзейнічае развіццю ў моладзі маральна-этычных якасцей, камунікатыўных здольнасцей і граматнасці. Гэта значыць, што літаратурнай мове не ўдзяляецца дастатковай увагі.

Калі вышэйшыя навучальныя ўстановы маюць магчымасці для ўздзеяння на маўленне сучаснай моладзі толькі часова (пэўны час навучання), то сродкі масавай інфармацыі – пастаянна. СМІ выступае асноўнай крыніцай стэрэатыпізацыі каштоўнасцей сучаснай моладзі. Актыўнае ўздзеянне аказвае тэлебачанне і інтэрнэт, так як яны з'яўляюцца агульнадаступнымі маладому пакаленню. Дзякуючы СМІ фарміруецца культурнае асяроддзе і задаюцца адпаведныя стэрэатыпы.

На аснове даных, атрыманых пасля анкетавання студэнтаў 1 курса тэхнічных спецыяльнасцей ГДТУ ім. П. В. Сухога, раскрываюцца адметнасці пры выбары і наборы моўных адзінак, а таксама высвятляецца роля СМІ ў працэсе фарміравання маўлення сучаснай моладзі. Пытанні анкеты «фарміраванне маўлення сучаснай моладзі», варыянты адказаў, колькасць рэспандэнтаў і іх працэнтныя суадносіны мы адлюстроўваем у наступнай табліцы.

У гэтай табліцы былі наступныя пытанні.

| **Пытанне** | **Варыянты адказаў** | **Колькасць рэспандэнтаў** | **%** |
|---|---|---|---|
| 1. Які Ваш пол? | а) мужчынскі | 82 | 71,3 |
| | б) жаночы | 33 | 28,7 |
| 2. Ці выкарыстоўваеце Вы жаргонныя слова ў зносінах? | а) да | 103 | 89,6 |
| | б) не | 12 | 11,4 |
| 3. З якой мэтай Вы ўжываеце жаргонныя словы? | а) самасцвярджэнне | – | – |
| | б) падтрымліваць зносіны | – | – |
| | в) не хапае слоўнікавага запасу | 10 | 8,7 |
| | г) прыцягненне ўвагі | 9 | 7,8 |
| | д) для зняцця стрэсу | 96 | 83,5 |
| 4. Якія жаргонныя словы Вы выкарыстоўваеце ў сваім штодзённым маўленні? | а) мацерныя | 12 | 10,4 |
| | б) сленг | 17 | 14,8 |
| | в) часам і тыя і другія: усё залежыць ад сітуацыі або кампаніі | 75 | 65,2 |
| | г) не выкарыстоўваю | 11 | 9,6 |
| 5. Ці робяць заўвагі наконт Вашага маўлення? | а) да | 9 | 7,8 |
| | б) выкладчыкі не звяртаюць увагі на маё маўленне | 12 | 10,4 |
| | в) не заўсёды, але ўсе ж робяць заўвагі | 32 | 27,8 |
| 6. Як адносяцца бацькі да Вашага маўлення? | а) ім не важна, як я гавару | 27 | 23,5 |
| | б) яны заўсёды гавораць, каб я сачыў за тым, як я гавару | 27 | 23,5 |
| | в) часам бацькі робяць заўвагі ў сувязі з маім маўленнем | 61 | 53 |
| 7. Чыё маўленне для Вас з'яўляецца эталонам? | а) маіх бацькоў<br>б) маіх выкладчыкаў | 82 | 71,3 |
| | в) тое, як говораць на тэлебачанні і радыё | 33 | 28,7 |
| 8. Якое ўздзеянне аказваюць СМІ на фарміраванне маўлення сучаснай моладзі? | а) негатыўнае | 32 | 27,8 |
| | б) пазітыўнае | 9 | 7,8 |
| | в) хутчэй пазітыўнае, чым негатыўнае | 74 | 64,4 |

*Аканчэнне табл.*

| Пытанне | Варыянты адказаў | Колькасць рэспандэнтаў | % |
|---|---|---|---|
| 9. Якім крыніцам інфармацыі Вы аддаеце перавагу? | а) інтэрнэт<br>б) ТБ | 75 | 65,2 |
| | в) радыё<br>г) друкаваныя СМІ<br>д) іншыя зносіны, кнігі, вуліца | 40 | 34,8 |

Адной з асноўных праблем, выяўленых у працэсе анкетавання студэнтаў, з'яўляецца частае выкарыстанне жаргоннай лексікі (90,4 %). Вельмі непакоіць псіхічны стан моладзі, так як асноўнай мэтай выкарыстання жаргоннай лексікі стала зняцце стрэсу (83,5 %). Даныя даследавання паказалі, што СМІ ўздзейнічаюць на фарміраванне маўлення сучаснай моладзі хутчэй пазітыўна, чым негатыўна (адказ-ваганне – 64,4 %), але гэта паказвае больш няўпэўненасць студэнтаў, для якіх асноўнай крыніцай інфармацыі з'яўляюцца ТБ і інтэрнэт. Радуе тое, што для большасці рэспандэнтаў маўленне бацькоў і выкладчыкаў з'яўляецца эталонам (71,3 %), але адначасова выклікае непаразуменне такая вялікая колькасць выкарыстальнікаў жаргоннай лексікі. Цікавы той факт, што большасць студэнтаў не ведаюць пра існаванне вытрымкі з кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (ст. 10.5). Мелкае хуліганства. «Нецэнзурная лаянка ў грамадскім месце, зняважальнае прыставанне да грамадзян і іншыя наўмысныя дзеянні, што парушаюць грамадскі парадак, дзейнасць арганізацый або спакой грамадзян, якія выражаюцца ў яўнай непавазе да грамадства, – цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх да трыццаці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт» [2].

Такім чынам, неабходна адзначыць, што фарміраванне маўленчай культуры і замацаванне пазіцый літаратурнай мовы моладзі з'яўляецца актуальнай задачай.

Літаратура

1. Жук, А. И. Образование как основа обеспечения национальной безопасности Республики Беларусь / А. И. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2014. – № 3.
2. Рэжым доступу: http://sch139.minsk.edu.by/main.aspx?guid=11131. – Дата доступу: 18.04.2014.